ЯК ТАМ, НА МЫТНІ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Напрыклад, толькі за адзін дзень, перад тым, як нам давялося прысутнічаць у «Брузгах», праз беларускую мытню прайшлі ў абодвух напрамках 70 тысяч чалавек, больш як 5,8 тысячы грузавых транспартных сродкаў, звыш 14 тысяч адзінак легкавога транспарту і больш за 500 аўтобусаў. Таксама варта ўключыць сюды і 103 самалёты з 186 чыгуначнымі саставамі. Усяго за адзін тыдзень выяўлена 556 правапарушэнняў і распачата 15 крымінальных спраў. І гэта не мяжа, бо, па словах Юрыя Сянько, хуткасць пропуску працягвае павялічвацца ў тым ліку і дзякуючы інфармацыйным тэхналогіям. І ў далейшым развіццё інфраструктуры ў пунктах пропуску будзе накіравана перш за ўсё на стварэнне яшчэ больш камфортных умоў для тых, хто перасякае мяжу. Рабіцца гэта будзе ў тым ліку за кошт аўтаматызаваных сістэм.

«Ужо ў наступныя паўтара месяца на пункце пропуску «Брузгі» мы правядзём эксперымент. Плануем, што некаторыя дэкларацыі будуць падавацца грузавымі транспартнымі сродкамі ў электронным выглядзе. Супрацоўнік мытні не будзе да іх нават дакранацца рукамі. Прымаць рашэнне і выдаваць дазвол на транзіт будзе камп'ютар. Астатнія фармальнасці, звязаныя з далейшай апрацоўкай гэтай электроннай дэкларацыі, будуць праводзіць падраздзяленні аналізу рызык, каб у эксперымент трапілі толькі законапаслухмяныя асобы. Мы давяраем бізнесу, але і не можам прапусціць парушальніка. Зараз мы хочам зрабіць стаўку на аналітыку і аўтаматызацыю», — расказаў журналістам Юрый Сянько. Пры гэтым ён падкрэсліў, што аналагічна развіваюцца і нашы замежныя калегі. Беларуская мытня ад іх не адстае і нават у чымсьці апярэджвае.

Таксама старшыня Мытнага камітэта нагадаў, што ў краіне асноўная колькасць транспартна-лагістычных цэнтраў знаходзіцца каля Мінска. «Наша мэта сумесна з памежнай службай забяспечыць поўнае афармленне транспартных сродкаў пры ўездзе на тэрыторыю Беларусі. У кастрычніку, як чакаецца, тут будзе запушчаны першы ў краіне транспартна-лагістычны цэнтр, размешчаны ў непасрэднай блізкасці ад пункту пропуску. Тут можна будзе прайсці ўсе мытныя фармальнасці: аплаціць мытныя плацяжы і далей бесперашкодна рухацца ў любым кірунку. Тавар будзе цалкам вольны ад неабходнасці мытнага кантролю ў далейшым. Гэта спросціць працу для бізнесу і паскорыць атрыманне тавару», — расказаў старшыня ДМК. Таксама плануецца што падобныя транспартна-лагістычныя цэнтры будуць з'яўляцца па меры мэтазгоднасці сумесна з разлікамі ўсіх зацікаўленых міністэрстваў.

Парашок з тэлефонамі, а колы з адзеннем

Адна справа, калі ты чуеш, як працуюць супрацоўнікі мытні, але зусім іншая, калі бачыш гэта знутры. Усіх журналістаў, хто прыехаў у «Брузгі», пазнаёмілі з арсеналам прыбораў і сродкаў, якія дазваляюць знайсці нават самыя хітрыя схованкі. Па словах **начальніка мытнага паста «Брузгі-2» Сяргея АЛЕШЧАНКІ,** нелегальна звычайна перавозяць тэлефоны, ноўтбукі, каштоўнасці, прадметы даўніны, кантрабанду накшталт цыгарэт або прадуктаў харчавання. Радзей — наркотыкі: быў выпадак, што спрабавалі правесці нават торт з псіхатропным начыннем. Экзотыка таксама не выключэнне — везлі нават біўні маманта і рарытэтныя аўтамабілі.

Далей журналістам паказалі так званы бокс паглыбленага надгляду, куды трапляюць толькі тыя аўтамабілі, на якія пакажа сістэма кіравання рызыкамі. А яна аналізуе такія фактары, як частата перасячэння мяжы і ўчыненыя раней правапарушэнні. У гэты раз пад пільным поглядам мытнікаў аказалася легкавое аўто «Фольксваген». На спецыяльным стале спецыялісты пачалі раскладваць змесціва аўтамабіля. Падазрэнні выклікала скрынка з пральным парашком. Іх пацвердзіў металадэтэктар, які па-здрадніцку пачаў сігналізаваць. Спецыялісты задзейнічалі іншыя, больш незвычайныя прыборы: у ход пайшлі і камеры на гнуткіх ручках, якія дазваляюць разгледзець дно і іншыя месцы з патайнымі пустотамі. Дапамог і лазерны дальнамер, які дазваляе вызначыць схаваныя нішы ў машыне, і сканер схаваных пустот пад назвай «Ватсан». Дарэчы менавіта ён і падказаў, што насамрэч у шынах легкавіка было зусім не паветра. Пакуль у працу ўключаліся кінолаг і яго сабака, інспектары мытні праверылі праз рэнтгенаўскі апарат кола і каробкі з пральным парашком. Яны і выявілі, што ў адной з каробак быў таксама не толькі парашок, а падазрэнні з колам толькі пацвердзіліся. Як вынік — мабільныя тэлефоны і духі з пахам парашку, а вось у коле знайшлі каля дзясятка камплектаў дзіцячага адзення. Вядома, гэта была толькі імітацыя, але журналістам расказалі, што гэта хутчэй тыповыя схованкі. Бываюць і значна больш «цікавыя» спосабы.

Знайшлі, але не ўсе

Каб зразумець, як гэта няпроста — знайсці схаваную кантрабанду, журналістам таксама далі паспрабаваць сябе ў ролі супрацоўніка мытнага камітэта. Нам прыгналі стары бус «Фольксваген», у якім была схавана «закладка». Прызнаюся, шукалі доўга і нязладжана. Але і сярод карэспандэнтаў былі вельмі ўважлівыя людзі — знайшлі грошы і наркотыкі. Аднак, як аказалася, гэта было далёка не ўсё. Калі пасля паўгадзіны зацятых пошукаў мы ўсё ж здаліся, на дапамогу прыйшоў спецыяліст-кінолаг і службовы кокер-спаніэль Санта. Сабака вельмі дысцыплінаваны і скрупулёзны ў пошуку — яго мала што можа адцягнуць. Найбольш эфектыўна ён шукае менавіта наркотыкі. Для яго гэта гульня — сабака навучаны так, што яму здаецца, нібы ён шукае сваю цацку. Як нам расказалі, працаваць Санта можа да 12 гадзін, але адпачынак патрэбен. Калі ён дагуляў у сваю «гульню», кінолаг змог дастаць з тайніка яшчэ і наркатычныя рэчывы. На гэта дуэту спатрэбілася хвілін 10, прытым што кінолаг адказваў на пытанні журналістаў.

Тры страшныя літары для кантрабандыста

18 снежня 2015 года на пункце пропуску «Брузгі» запрацаваў ІНК — інспекцыйна-надглядальны комплекс, ці велізарны рэнтген, які значна паскарае працу з буйным грузавым транспартам. Падазроныя фуры тут прасвечваюць і аналізуюць за 15 хвілін без разгрузкі. Накіроўваюць сюды таксама не ўсіх, а толькі паводле звестак сістэмы кіравання рызыкамі. **Начальнік аддзела правядзення аперацый мытнага кантролю Віталь ПАРФЁНАЎ** распавёў, што яшчэ не так даўно на падобныя аперацыі ішло часу ад гадзіны да цэлага дня. Пасля таго, як праведзена сканаванне, малюнак выводзіцца на экран аператара-аналітыка, які здольны разглядзець нават самыя незвычайныя схованкі. Нягледзячы на тое, што ІНК абышоўся ў 2,5 млн еўра і ў яго ўбудавана самае перадавое абсталяванне, ён не будзе працаваць эфектыўна без прафесіянала. Для працы з комплексам, дарэчы, інспектары праходзяць дадатковае навучанне. На малюнку, які з'явіўся на экране камп'ютара пры аналізе адной з фур, была вялікая колькасць дэталяў. Спецыяліст зверыў з дакументамі ўвесь груз, які без праблем можна разгледзець прафесіяналу. Рухавік і кузаў праглядаюцца выразна, і там звычайна нічога не хаваюць. Часцей, вядома, неабходна звяртаць увагу на грузавы адсек. Дэталёва праглядаюцца і пустоты ў шасі — выпадкі са знаходжаннем кантрабанды былі нават там. Схаваць ад рэнтгену можна хіба толькі шпільку, і то адну. Некалькі шпілек тэхніка ўжо заўважыць. Вось і мы дзякуючы інспектару зноў знайшлі імітацыю кантрабанды — 10 скрынак спіртных напояў, якія не былі пазначаны ў дакументах. Па словах супрацоўнікаў мытні, кожны рубель выдаткаў на працу ІНК прыносіць бюджэту да 48 рублёў даходу.

Міф пра 50%

Мяне заўсёды цікавіла пытанне адносна мытных інспектараў. Справа ў тым, што ў інтэрнэце, ды і сярод маіх знаёмых, хадзілі чуткі, што супрацоўнікі мытні, якія знаходзяць буйныя партыі кантрабанды, атрымліваюць ледзь не 50% ад знойдзенага. Гэта, па ідэі, павінна стымуляваць эфектыўнасць працы. Я не верыў, але спытаць усё ж наважыўся. Як мне сказалі, гэта сапраўды толькі чуткі. За 25 гадоў незалежнасці краіны, ды і ў савецкія часы, такога ніколі не было. Бо які б негатыў у людзей выклікала разуменне таго, што інспектар працуе не дзеля іх бяспекі, а дзеля жадання зарабіць сабе большыя грошы! Ды і інспектарам зусім не падабаецца быць прадузятымі. Яны працуюць у першую чаргу на карысць нашай краіны. Часам незаўважна. Напэўна, іх дзейнасць можна параўнаць з працай чалавечага арганізма — калі ўсё добра, мы не задумваемся пра тое, як там усё функцыянуе. Але гэта мяняецца, калі нам становіцца дрэнна. Працу мытных інспектараў мы не бачым — значыць, усе 25 гадоў яны працуюць сумленна.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
Kryzhevich@zviazda.by

■ Цікавы досвед

ДЗЕ ПАСЕЛЯЦЦА ЗНІКЛЫЯ ВЁСКІ?

У Зашырскім культурна-спартыўным цэнтры

Аграгарадок Зашыр'е, што ў Ельскім раёне на Гомельшчыне, вылучаецца творчай атмасферай. На тэхнічных памяшканнях мясцовага саўгаса «Камуніст» — беларускія вершы яго старшыні Рыгора Бабчанкі і маляўнічыя выявы нашых краявідаў. Але гэта толькі пачатак...

Будынак Зашырскага культурна-спартыўнага цэнтра на першы погляд мала чым (калі не ўлічваць шыкоўных клумбаў) адрозніваецца ад іншых, збудаваных у савецкі час. На ўваходзе ў яго нас сустракае дырэктар цэнтра Яўгенія Шадрына і адразу праводзіць у актавую залу. Дакладней, ва ўладкаваную на «хорах» міні-кавярню, у якой можна пачаставацца гарбатай і абмеркаваць канцэрт. Увогуле цэнтр нічым не горшы за гарадскі: тыя, хто наведваюць яго гурткі, часта бываюць за мяжой на фестывалях, атрымліваюць узнагароды. А КСЦ у сваю чаргу неаднаразова прызнаваўся найлепшым не толькі ў раёне, але і ва ўсёй краіне. Як прызнаецца дырэктар, без дапамогі чулага і творчага старшыні саўгаса Рыгора Бабчанкі нічога б не атрымалася...

«І ў глыбінцы ўмеюць культурна адпачываць, — смяецца Яўгенія Шадрына, пабачыўшы мой здзіўлены позірк. — Добры канцэрт правялі, ён пакінуў пасля сябе эмоцыі, і што? Пасля бясследна знік. А хочацца штосьці пакінуць пасля сябе. Так мы прыдумалі стварыць Рамесніцкі цэнтр, які вечарамі будзе працаваць як забаўляльны, але з сэнсам. Бо ў нас ёсць тэатральны калектыў, фальклорны, эстрадны, свая майстэрня па шыцці касцюмаў, шоу мыльных бурбалак, якое нават не ва ўсіх гарадах сустрэнеш, і нават клоўн. Мы імкнёмся зрабіць разнастайным вольны час людзей для таго, каб не адчувалася «забітасці» і знікла думка, што ў горадзе лепш, чым у нас».

Але Яўгенія Аляксандраўна шчыруе не толькі на карысць аграгарадку, але і ўсяму раёну. У Зашырскім КСЦ паступова будуецца цэнтр зніклых вёсак усяго Ельскага раёна. Кожная з маленькіх хатак адводзіцца пад такі населены пункт, а ўнутры яе — уласцівыя кожнай вёсцы рэчы: мэбля, адзенне, бялізна, абразы, а таксама фальклорны матэрыял (відэа, фота, аудыяінтэрв'ю з карэннымі жыхарамі вёсак, якіх ужо няма), запісаны на дыскі. «У кагосьці настальгія па роднай вёсцы. А яе няма ўжо. Чалавек, напрыклад, вырашыў наведаць яе, прыехаў з Санкт-Пецярбурга ці Саратава, а там лес расце. Тады можна прыехаць да нас, зайсці ў хатку і акунуцца ў атмасферу роднай мінуўшчыны. Бо сёння той пласт побыту, у якім жылі стагоддзямі мінулыя пакаленні, адыходзіць», — расказвае Яўгенія Шадрына.

Пакуль гэты праект, як і ўсё астатняе ў культурна-спартыўным цэнтры, робіцца выключна рукамі супрацоўнікамі цэнтра і трымаецца на ініцыятыве іх і дырэктара. Спадарыня Яўгенія прыгадвае, як расчышчалі задні двор ад смецця, бетанавалі яго (спачатку, як гэта рабіць, паказваў спецыяліст, пасля пачалі самастойна спраўляцца), хадзілі па гарадку і збіралі шкляныя бутэлькі, якія пасля разбівалі і ўпрыгожвалі асколкамі будынкі. Паўсюль на вуліцы — скульптуры галубоў, аленяў, рыцараў, коней, зробленыя са звычайнай цэглы, пяску і арматуры. Аўтарка ўсіх іх Яўгенія Шадрына. Але без дапамогі стваральнікаў каркасаў будучых скульптур з арматуры, дапаможнікаў у непасрэднай лепцы не абышлася б. Прытым зроблена ў КСЦ усё сапраўды самастойна — нават ліштвы і рамы вокнаў, фантаны ў двары.

Сам Рамесніцкі цэнтр — гэта некалькі дамкоў, кожны з якіх адведзены пад пэўнае рамяство: ганчарня, сталярня, бандарня, кузня. Пры гэтым самі будынкі знешне выкананы ў традыцыйным стылі, набліжаным максімальна да таго, як яны выглядалі раней. Але ўнутры, мяркуе Яўгенія Шадрына, інструменты мусяць быць сучаснымі. З цягам часу, калі цэнтр назбірае сродкаў на абсталяванне ці хтосьці дапаможа матэрыяльна, сюды можна будзе прыходзіць па майстар-класы і вучыцца забытым тэхнікам. «Я калі прыходжу раніцай на працу і бачу, якое навокал усё прыгожае, то мне і працаваць хочацца. Калі б мы не зараблялі дадаткова, то, напэўна, не выжылі б», — дзеліцца яна.

Яўгенія Аляксандраўна ідзе і паказвае: тут мы ажывім легенды, тут збудуем балконы, тэрасы, сажалку, там змайструем камін, камп'ютарны кабінет... Яна не абмяжоўваецца адным раёнам, а спадзяецца, што з цягам часу тэрыторыя цэнтра стане пляцоўкай для рэспубліканскага, а то і міжнароднага фестывалю. «Усе б выйгралі, каб кожны па магчымасцях упрыгожыў месца, дзе жыве і працуе, — гаворыць жанчына. — І тады ўчынкі ў людзей, глядзіш, былі б чысцейшымі. Вядома, без скульптур і цэнтра можна было б абысціся. Але гэта патрэба маёй душы — самавыразіцца. Працуем, і ідэі не сканчаюцца. Не гляджу, ёсць грошы ці няма, дапамагаюць нам ці не. Пакуль ёсць сілы, буду працягваць працаваць. Мо талакою і раён зробім лепшым».

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by